Наконт інтэрв'ю са Старшынёй Саюза палякаў Беларусі Тадэвуша Гавіна „Мы тут не чужыя" (Звязда №38, 6 лютага 1993г.

Modern History Archives
Archiv Najnowszej Historii
Fond 9146/13

Тадэвуш Гавін са сваім Саюзам Палякаў — гэта польскі траянскі конь у РБ.

Няўжо ён ня ведае, што палякі у Беларусі чужыя. Каланізаваць яны нашу краіну пачалі з 1385 года — Крэўскай вуніі і з часам інтэнсіўнасць каланізацыі нарастала, асабліва пасля таго, як Зігмунт Аўгуст у 1569 годзе беларуская Падляшша (цяперашняя Беласточчына) далучыў да Польшчы і масовая каланізацыя беларускіх земляў палякамі, асабліва духавенствам, пачалася пасля рэлігійнай Берасцейскай вуніі у 1595 г. А пасля 1-й Сусветнай вайны беларускія землі засяляліся асаднікамі — былымі польскімі вайскоўцамі.

Запраўдных, не статыстычных, палякаў у Беларусі не 4%, а значна меньш, бо у Беларусі палякамі запісывалі у наймарт каталікоў-беларусаў, у большасці сваёй неадукаваных ці

vytoki.net

ці малаадукаваных, зацюканых, нацыянальна неўсвядомых людзей. Нажаль, да гэтага часу ўрад РБ не выправіў гэты від паланізацыі беларускага люду: шматлікія беларусы да гэтага часу значацца па пашпарту, без усялякага самавызначэння, палякамі.

Беларусы будавалі незалежную Польшчу, незалежную Расію, а палякі і рускія пражываючыя на нашай зямлі не будавалі, не будуюць і не будуць будаваць незалежную Беларусь, бо гэта не ў іх духу. Незалежную Беларусь могуць будаваць толькі нацыянальна-свядомыя беларусы.

Тадэвуш Гавін не крывіць душой. Лёс беларусаў яго зусім не хвалюе, а стратэгічная мэта Саюза палякаў Беларусі (СПБ) – гэта найперш адраджэнне польскай мовы і культуры. Вучыцеся беларусы, як трэба шанаваць і адраджаць у сваім доме сваю мову і культуру! І пан Гавін ня спіць у шапку. А правёўшы інтэрв'ю Віталь Цыганкоў, судзячы па яго пытанню, думае і пра польскую аўтаномію на нашай этнічнай беларускай зямлі. У той час, як у Польшчы беларусам, пражываючым на сваёй этнічнай тэрыторыі няма такоя. Мы беларусы, як і палякі ў Польшчы, рускія ў Расіі, немцы ў Германіі

vytoki.net

балгары у Балгарыі і г.д. не дазволім нікалі на нашай гістарычнай тэрыторыі не-раслімуючымся к нам чужынцам, свае аўтаноміі. Як вядома, спачатку „вызваляюць“, потым застаюцца на захопленай тэрыторыі і наводзяць свой „парадак“, затым лічаць сябе у чужым доме ужо „не чужымі“, далей адраджаюцца, ствараюць свае культурныя установы, затым патрабуюць аўтаноміі, і, нарэшце, далучэння аўтаномнай чужой тэрыторыі да сваёй этнічнай радзімы, а далей пачынаюцца Карабахі, Прыднястроўе, Асеція, Абхазія, Віленшчына і г.д.

А размовы наконт празрыстасці граніцы і г.д. — гэта для прастакоў. Усяму свой час.

Праблему беларусаў у Віленшчыне (а гэта іх этнічная і гістарычная тэрыторыя) Тадэвуш Гавін ужо не бярэ у разлік. Ён мае на увазе толькі два бакі: літоўскі і польскі. А палякі тут — гэта галоўным чынам акаталічаныя і апалячаныя мясцовыя беларусы.

Сёння у пана Тадэвуша у РБ 300 польскіх школаў і тыраж газеты 12 тысяч. Вось так! Пакуль у нашых беларускіх „ка-інтэрнацыяналістаў“ — сонных і нацыянальна несвядомых карасей прабудзіцца нацыянальная свядомасць, Гавіны з Захаду, а Івановы з Усходу укладуюць католікаў у польскія, а праваслаўных беларусаў у рускія навучальныя установы.

④ У суверэннай РБ беларускія дзеткі апалячваюцца і русіфікуюцца як і ў самыя "лепшыя" часы польскай і расійскай каланізацыі, пачынаючы ад садзікаў і канчаючы вузамі, а марыянетачны беларускі ўрад хлопае вушамі, бякае і разводзіць рукамі.

СПБ – гэта згуртаванне польскіх каланізатараў у нас, якія нашу Краіну лічаць сваімі "Крэсамі Усходнімі". Гэта ўдалбліваецца палякам у Польшчы, асабліва моладзі, за межамі Яе. Глыбока выношываецца ідэя далучэння да Польшчы усходніх тэрыторый былой Рэчы Паспалітай, а палякі не беларусы, людзі самавітыя, патрыятычныя і сродкаў для СПБ не шкадуюць і шкадаваць не будуць, ды яны іх заробяць на беларускіх рабах, якія нелягальна працуюць у Польшчы каб не згінуць з голаду. Паразуменне паміж палякамі фундатарамі СПБ нацыянальнае, духоўнае і яны адзін другога добра разумеюць і аб ніякай незалежнасці руху ніякай не можа быць гаворкі.

Каб штучна не ўвялічвалася колькасць "пашпартных" палякаў за шчот нацыянальнасвядомых беларусаў-католікаў па эканамічных ці іншых прычынах трэба каб павінны канкрэтны выпадак жадання стаць "палякам" із-за выгады вырашацца спецыяльнай камісіяй па нацыянальнаму пытанню і міжнацыянальных адносінах. Нельга

дапускаць каб із беларусаў рабілі штучных палякаў (рускіх). Прынцып нацыянальнага самасвядомасці нігдзе не прызнаецца, у тым ліку і ААН. Можна мяняць грамадзянства, а не нацыянальнасць.

Што праўда, то праўда: палякаў у Беларусі прыгняталі пры Сталіне, асабліва у ваенныя часы. Часць іх высялілі у лагер смерці КПСС (бальшэвікоў), афіцэраў і многіх другіх растралялі, а па дагавору 1944г. многа выехала із Заходняй Беларусі палякаў і палякаў-беларусаў у Польшчу, а вакум занялі камісары, сакратары, ваеводцы, начальнікі, старшыні і г.д. наезжыя із Расіі.

Пятая калона Польшчы у Беларусі - гэта не толька СПБ, ці і каталіцкае духавенства. Яны ня толька вывешываюць польскі сцяг, але і запяваюць польскія нацыянальныя гімны, надпісы у касцёлах нарабілі на польскай мове, апалячываюць католікаў-беларусаў, дэстабілізуюць міжнацыянальныя адносіны у нашай краіне, псуюць палітычную атмасферу. Беларускія касцёлы будавалі беларусы. Ім у іх маліцца на сваёй мове і надпісы у іх павінны быць зроблены на роднай беларускай мове.

Дзейнасць розных нацыянальных саюзаў павінна кантраляваць наша дзяржава, каб яны ведалі, што ~~яны~~ дзейнічаюць у нашай беларускай нацыянальнай дзяржаве, а не у Польшчы, Расіі, Літве, Ізраілі і г.д.

4.III.1993г.

[illegible]

vytoki.net